Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
9 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №108 (28472)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як мы змагаемся за цішыню ў кватэры?
СТАР. 4



Гісторыя «мыльных опер»
СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень
20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль СІВАК, міністр транспарту і камунікацый:**

*«Мы ўсведамляем, што развітая транспартная інфраструктура не толькі паляпшае імідж краіны, але і спрыяе зніжэнню сабекошту дастаўкі тавараў, а інвестыцыі, што накіроўваюцца ў яе, ускосна ўплываюць на ўсе галіны эканомікі. Нездарма старажытная мудрасць сцвярджае: «Хочаш стаць багатым — пачынай будаваць дарогі». У сувязі з гэтым у Беларусі ўдзяляецца асаблівая ўвага развіццю і мадэрнізацыі транспартнай інфраструктуры, прызначанай для арганізацыі міжнародных перавозак».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8733 | ▲ |
| Еўра | 2,1080 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0716 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Электробус едзе ў Астану



**Беларусь пакажа каля 50 высокатэхналагічных распрацовак на Міжнароднай спецыялізаванай выставе «ЭКСПА-2017» у сталіцы Казахстана.**

Сёлета галоўнай тэмай выставы стане энергія будучыні. На працягу трох месяцаў, пачынаючы з 10 чэрвеня, на ЭКСПА будуць паказвацца навінкі ў гэтай галіне. Беларусь прывязе распрацоўкі Мінадукацыі, Мінпрама і Нацыянальнай акадэміі навук. Сярод іх электробус, макет аўтобуса МАЗ на газавым паліве, магутныя крыніцы сілкавання шырокага прымянення, энергаэфектыўныя матэрыялы і тэхналогіі. На нашым стэндзе прэзентуюць 14 інвестыцыйных праектаў, напрыклад, будаўніцтва Бешанковіцкай ГЭС і новую этылен-прапіленавую ўстаноўку на «Нафтане». Дарэчы, дзень Беларусі на ЭКСПА пройдзе 16 жніўня.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*




Фота БЕЛТА.

■ Прыёмная кампанія — 2017

## Толькі з параднага ўвахода

### Экзамены і залічэнне ў студэнты павінны прайсці сумленна і празрыста

**«Дзяржаўная камісія з'яўляецца магутным інструментам у руках абітурыентаў і іх бацькоў для забеспячэння ўсім роўнага доступу да вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі», — такую думку выказаў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід АНФІМАЎ на пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў. Напярэдадні старту цэнтралізаванага тэсціравання ў сценах КДК абмеркавалі ўсе нюансы кантролю за ўступнай кампаніяй.**

СТАР. 3



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Занятасць

## ПАДАБРАЦЬ ВАКАНСІЮ ЗА ТРЫ ДНІ

### Колькі каштуюць паслугі агенцтваў па працаўладкаванні?

**Шукаць работу — таксама работа. Пісаць пра сябе ў рэзюмэ, маніторыць вакансіі, хадзіць па гутарках... Паскорыць пошук прапануюць агенцтвы па працаўладкаванні. «Звязда» даведалася, колькі каштуюць іх паслугі, каму складаней падабраць вакансію і як на дзейнасць агенцтваў паўплывалі змены ў заканадаўстве.**

### «ПРЫЙШОЎ, БО ЖОНКА АДПРАВІЛА»

Спіс паслуг усіх агенцтваў па працаўладкаванні прыкладна аднолькавы — расказваюць пра вакансіі, складаюць за вас рэзюмэ, звязваюцца з наймальнікамі, каб прарэкламаваць вашу кандыдатуру. Некаторыя прапануюць яшчэ і работу за мяжой, напрыклад у Расіі ці Польшчы.

— У Беларусі ў прынцыпе за месяц працу можна знайсці. Вакансіі ёсць, нават з высокімі заробтнымі платамі — 800 рублёў і вышэйшымі, — кажа **дырэктар агенцтва «Першае рашэнне» Інэса ЦІШКЕВІЧ.**

Каб павысіць шанцы саіскальніка, яго рыхтуюць да гутаркі. Інэса Цішкевіч тлумачыць, што гэта больш псіхалагічная работа. З парад — задаваць менш пытанняў работадаўцам, толькі асноўныя і па справе, бо наймальнікі допыт не вельмі любяць.

Па дапамогу ў агенцтва ў асноўным звяртаюцца спецыялісты, якіх навучальнымі ўстановамі выпускаецца шмат, а адпаведных працоўных месцаў мала: юрысты, эканамісты, бухгалтары. Што да самых запатрабаваных вакансій, то сярод іх — ахоўнік, кіроўца, адміністратар, рабочыя спецыяльнасці (укладчыкі, упакоўшчыкі, рознарабочыя), нейкая падпрацоўка.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!